Крыніца: adu.by Нацыянальны інстытут развіцця адукацыі

**Дэма-версія практычнага задання для экзамена па гісторыі Беларусі, для навучэнцаў 9-х класаў (2022/2023 навучальны год). Білет 19. Варыянт 3**

**Білет 19. Практычнае заданне. Наш край у XIII-XVIII стст.**

**Заданні склала:** Варыкава Святлана Іванаўна, настаўнік гісторыі і грамадазнаўства ДУА «Лучынская базавая школа» Рагачоўскага раёна

**Выкарыстоўваючы прадстаўленыя матэрыялы, адкажыце на пытанні:**

1. Назавіце кіраўніка, пры якім тэрыторыя Гомеля пачала ўваходзіць у склад Вялікага княства Літоўскага?
2. Як палітычныя адносіны паміж Вялікім княствам Літоўскім і Вялікім княствам Маскоўскім паўплывалі на становішча Гомеля ў першай палове XVI ст.?
3. Чаму тэрыторыя Гомельшчыны ў розны гістарычны час аказвалася ў складзе розных дзяржаў?
4. Ці можна лічыць, што ў першай трэці XVI ст. устанаўленне новага ўчастка маскоўска-літоўскай мяжы з'явілася пачаткам фарміравання дзяржаўных граніц, якія цяпер падзяляюць Рэспубліку Беларусь і Расійскую Федэрацыю?

**Крыніца I.Картасхема «Пашырэнне межаў ВКЛ у XIV ст.»**



Крыніца: adu.by Нацыянальны інстытут развіцця адукацыі

**Крыніца II. Картасхема «Вайны ВКЛ з Вялікім Княствам Маскоўскім у першай палове XVI ст.»**




**Крыніца III. Юрыдычныя асновы кіравання беларускімі землямі ў XIV-XVIII стагоддзях: гісторыя пытання (аглядная даведка)**

Па Пецярбургскай канвенцыі ад 5 жніўня 1772 г. у выніку падзелу Расія далучыла Ліфляндскае, большую частку Полацкага (на правым беразе Дзвіны), амаль усё Віцебскае, Мсціслаўскае ваяводствы, усходнюю частку Рэчыцкага павета Мінскага ваяводства з гарадамі Полацк, Віцебск, Магілёв. , Мсціслаў, Рагачоў, Гомель, Чачэрск і інш. Аўстрыя захапіла заходнюю частку Украіны са Львовам і паўднёвую частку Польшчы (ваяводства Рускае, частка Белзскага, Кракаўскага, Сандамірскага, ускраіны Валынскага, Падольскага); Прусія – паўночна-заходнюю частку Польшчы [Вармія, Паморскае ваяводства (без Гданьска), Мальбаркскае, Хелмінскае (без Торуня), частка Інаўроцлаўскага].

*А. Філатава, А. Анішчанка. Рэспубліка Беларусь: Энцыклапедыя. Т.6. Мінск: БелЭн, 2008. С. 371-372.*

Крыніца: adu.by Нацыянальны інстытут развіцця адукацыі

**Адказы:**

**1.**Альгерд

**2**. Паміж Вялікім княствам Літоўскім і Вялікім княствам Маскоўскім у першай палове XVI ст. адбывалася некалькі войнаў, пра гэта сведчыць картасхема "Вайны ВКЛ з Вялікім Княствам Маскоўскім у першай палове XVI ст.".

1) У ходзе вайны 1500–1503 гг. ВКЛ страціла вялізныя тэрыторыі на ўсходзе, у тым ліку раён Гомеля.

2) Вынікам вайны 1534–1537 гг. стала вяртанне Гомеля ў склад ВКЛ.

**3.**У XIV ст. тэрыторыя Гомеля была ўключана ў склад Вялікага княства Літоўскага - гэта быў перыяд, калі ВКЛ пашырала свае межы. На ўсходзе яно межавала з Маскоўскім княствам, якое набірала сілу.

Да XVIст. тэрыторыя Маскоўскага княства значна пашырылася за кошт былых уладанняў ВКЛ, страчаных у ходзе вайны 1500–1503 гг. Гомель аказаўся на заходняй мяжы Маскоўскай дзяржавы. У вайне 1534–1537 гг. ён быў вернуты ў склад ВКЛ. У 1772 г. (І раздзел Рэчы Паспалітай) паводле звестак, атрыманых у крыніцы 3, Гомель аказваецца ў складзе Расійскай дзяржавы.

Узмацненне і пашырэнне спачатку Маскоўскай дзяржавы, затым Расіі з аднаго боку, і паслабленне, у сувязі з гэтым ВКЛ з другога боку, садзейнічалі ўключэнню тэрыторыі Гомеля ў склад спачатку Маскоўскага княства, затым Расійскай дзяржавы.

**4.**З сярэдзіны XIVст. тэрыторыя сучаснай Рэспублікі Беларусь увайшла ў склад ВКЛ.
У XVI ст. была ўсталявана маскоўска-літоўская мяжа, якая з невялікімі зменамі падзяляе мяжу сучаснай Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі нягледзячы на тое, што паводле Пецярбургскай канвенцыі ад 5 жніўня 1772г. у выніку падзелу, Расія далучыла ўсходнюю частку Рэчыцкага павета Мінскага ваяводства, куды ўваходзіла частка сучаснай тэрыторыі Гомельшчыны з гарадамі Рагачоў і Чачэрск. Гэта сведчыць аб нейкай пераемнасці паміж дзвюма дзяржавамі больш чым праз пяцьсот гадоў.